# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта

БДУ

3 кастрычніка 2002 года, чацвер, № 12 (1860)


ВІНШУЕМ!

## Жарэс Алфёраў – ганаровы доктар БДУ

30 верасня ў актавай зале Ліцэя БДУ адбылося ўручэнне дыплома ганаровага доктара Беларускага дзяржаўнага універсітэта лаўрэату Нобелеўскай прэміі ў галіне фізікі, віцэ-прэзідэнту Расійскай акадэміі навук, ганароваму грамадзяніну Мінска Жарэсу Іванавічу Алфёраву.

Жарэс Алфёраў нарадзіўся 15 сакавіка 1930 года ў Віцебску, скончыў мінскую сярэднюю школу № 42. З 1990 года — віцэ-прэзідэнт АН СССР. У сакавіку 1989 года быў абраны народным дэпутатам СССР. 1 жніўня 1997 года быў уключаны ў склад Навуковага савета Савета бяспекі РФ.

19 снежня 1999 года быў абраны дэпутатам Дзяржаўнай Думы трэцяга склікання. Прафесар, акадэмік РАН і шэрага замежных акадэмій. Лаўрэат Ленінскай і Дзяржаўнай прэмій СССР.

Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага сцяга і ордэнам Кастрычніцкай рэвалюцыі, Залатым медалём імя Сцюарта Бэлантайна (ЗША). За вялікі асабісты ўклад у развіццё фізічнай навукі, арганізацыю беларуска-расійскага навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва, умацаванне сяброўства народаў Беларусі і Расіі ўзнагароджаны ордэнам Францішка Скарыны.

Лаўрэат Нобелеўскай прэміі ў галіне фізікі (2000 год) за распрацоўкі паўправадніковых элементаў, якія выкарыстоўваюцца ў звышхуткіх камп'ютарах і оптавалаконнай сувязі.

У 2001 годзе Жарэс Алфёраў стаў лаўрэатам прэміі Кіёта, якую ўручае фонд Інаморы (Японія), за перадавыя дасягненні ў галіне электронікі.

*Па інфармацыі прэс-службы БДУ*

МІЖНАРОДНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

## "Тэхнічная інфарматыка" ад немцаў

З 1 кастрычніка ў рамках праекта "Экспарт нямецкіх навучальных праграм" на факультэце прыкладной матэматыкі і інфарматыкі нашага універсітэта ўведзены новы курс — "Тэхнічная інфарматыка". Праект, які ў СНД ажыццяўляецца ўпершыню, фінансуецца Нямецкай службай акадэмічных абменаў (DAAD) за кошт сродкаў федэральнага міністэрства адукацыі і навуковых даследаванняў. На першым этапе беларусы павінны атрымаць ад нямецкіх партнёраў камп'ютарнае абсталяванне, аўдыторную мэблю, навучальную літаратуру.

Курс "Тэхнічная інфарматыка" быў распрацаваны каля 10 гадоў таму ва універсітэце ў Мангейме. Для арганізацыі новага курса ў БДУ факультэт матэматыкі і інфарматыкі універсітэта ў Мангейме (Германія) атрымаў на 2002 год сродкі ў памеры 450 тысячаў еўра. Галоўная задача новага курса — даць студэнтам веды ў галіне эканомікі прадпрыемства. Выпускнікі ФПМІ БДУ будуць мець поўнае ўяўленне пра вытворчы працэс на прадпрыемстве: ад навукова-даследчыцкіх і доследна-канструктарскіх работаў да вытворчасці і лагістыкі. Навучальны і даследчыцкі працэсы арыентуюцца на тое, каб іх вынікі прымяняліся на практыцы.

Канцэпцыя абапіраецца пераважна на нямецкі ўзор, аднак яго практычнае выкананне ажыццяўляецца цэнтрам "Інфармацыйныя тэхналогіі" НАН Беларусі і ФПМІ БДУ. Навучальны працэс будуць ажыццяўляць як беларускія выкладчыкі, так і нямецкія спецыялісты. Пасля заканчэння універсітэта студэнты, якія займаліся на гэтым курсе, атрымаюць два дыпломы — БДУ і універсітэта ў Мангейме. Выпускнікі будуць запатрабаваныя на сумесных беларуска-германскіх прадпрыемствах.

Гэты беларуска-нямецкі праект далёка не першы для нашага універсітэта ў галіне інфармацыйных тэхналогій. Не так даўно разам з расійскай кампаніяй ЮКОС быў створаны першы ў Беларусі цэнтр інтэрнэт-адукацыі, дзе штомесяц павышаюць кваліфікацыю дзесяткі школьных настаўнікаў. Усе гэтыя праекты ажыццяўляюцца ў рамках развіцця «Інфарпарка БДУ».

У далейшым нямецкі бок мяркуе ўвесці іншыя навучальныя курсы. Па заканчэнні фінансавання нямецкім бокам сродкі на далейшае існаванне курса будуць выдзяляцца спярша Беларускім дзяржаўным універсітэтам і Беларускім фондам інфарматызацыі. У перспектыве ж прадугледжваецца паэтапны пераход да фінансавання за кошт платы за навучанне.

*Па інфармацыі прэс-службы БДУ*

КАНФЕРЭНЦЫІ

## Супруноўскія чытанні

*Міжнародная навуковая канферэнцыя "Палеаславістыка і кампаратывістыка" прайшла 27-28 верасня. Арганізавалі яе кафедра тэарэтычнага і славянскага мовазнаўства і кафедра класічнай філалогіі. У працы канферэнцыі прынялі ўдзел вядомыя навукоўцы з Беларусі і Расіі, а таксама прадстаўнікі пасольства Грэцыі ў Беларусі.*

Навуковы сход мае яшчэ адну назву — III Супруноўскія чытанні, бо прысвячаецца ён памяці мовазнаўцы прафесара Адама Яўгенавіча Супруна (1928—1999). У 1966 годзе гэты вядомы лінгвіст заснаваў кафедру агульнага (цяпер тэарэтычнага) і славянскага мовазнаўства на філалагічным факультэце БДУ, якой і кіраваў да канца жыцця. А.Я. Супрун быў сябрам Беларускага камітэта славістаў, пастаянным удзельнікам Міжнародных кангрэсаў славістаў і Кангрэсаў МАВРМЛ (МАПРЯЛ). Ён займаўся славістыкай, беларусістыкай, русістыкай, тэарэтычным і прыкладным мовазнаўствам, методыкай выкладання мовы.

На пачатку канферэнцыі намеснік дэкана філалагічнага факультэта, прафесар І.С. Роўда выказаў падзяку Часоваму паверанаму Рэспублікі Грэцыя ў Рэспубліцы Беларусь спадару Андрэсу Сьяхасу за спонсарскую падтрымку кафедрам, якія арганізавалі канферэнцыю. Прысутным падаліся вельмі цікавымі даклады нашых навукоўцаў В.У. Мартынава «Лінгвістыка і аналітычная алгебра», Б. Ю. Нормана «Семантыка «прамога» і «крывога» ў гістарычнай лексікалогіі», Г.І. Шаўчэнка «Знакавая сутнасць тапонімаў у фразеалогіі», Н. Б. Мячкоўскай «Старажытныя семантычныя механізмы абароны агульназначнай інфармацыі і іх сучасныя аналагі», а таксама масквічкі М.М. Славяцінскай «Граматыка і рэматыка», Т.У. Раждзественскай з Санкт-Пецярбурга «Сярэдневечныя надпісы ў храмах Старажытнай Русі».

Засталіся задаволенымі ўдзельнікі канферэнцыі і наладжанай для іх культурнай праграмай, паездкай у этнаграфічны музей пад адкрытым небам у вёсцы Строчыцы.

Па выніках канферэнцыі будзе выдадзены зборнік дакладаў пад назвай «Палеаславістыка і кампаратывістыка».

*Вольга АНІНА*

З НАГОДЫ

## Экалагічны турызм. Перспектыўны напрамак

27 верасня на факультэце міжнародных адносін праходзілі турысцкія чытанні, прымеркаваныя да Міжнароднага дня турызму.

На сустрэчу са студэнтамі былі запрошаны начальнік аддзела турызму і экалагічнай асветы Кіраўніцтва справамі прэзідэнта Беларусі І.М. Чарназіпуннікаў, дырэктар Нацыянальнага турыстычнага агенцтва Ч.К. Шульга, генеральны дырэктар турыстычнага агенцтва "Смок" Р. Мусаеў, дырэктар турыстычнага агенцтва "Дудуткі-тур" В.А. Кліцунова і інш. Абмяркоўваліся праблемы беларускага турызму, у прыватнасці — як зрабіць Беларусь прывабнай для замежных турыстаў. Удзельнікі сустрэчы прыйшлі да высновы, што найбольш перспектыўны накірунак для Беларусі ў турыстычнай сферы — экалагічны турызм.

ПРЭЗЕНТАЦЫІ

## Міжнародны часопіс для навукоўцаў

*Прэзентацыя міжнароднага міждысцыплінарнага часопіса "Нелинейные явления в сложных системах" прайшла 23 верасня ў зале пасяджэнняў Вучонага савета БДУ ў рамках Міжнароднай школы-канферэнцыі "Нелінейная дынаміка і складаныя сістэмы".*

Часопіс выдаецца з 1998 г. сумесна Беларускім дзяржаўным універсітэтам, Інстытутам фізікі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, выдавецтвам "Адукацыя і выхаванне". Галоўныя сурэдактары часопіса — Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь у Аўстрыйскай Рэспубліцы, пастаянны прадстаўнік пры міжнародных арганізацыях у Вене прафесар В.А. Гайсёнак і загадчык лабараторыі Інстытута фізікі НАН Беларусі прафесар В.І.Куўшынаў.

У рэдакцыйную калегію разам з прадстаўнікамі Беларусі ўваходзяць навукоўцы з Англіі, Галандыі, Германіі, Грэцыі, ЗША, Расіі, Славеніі. А міжнародная дарадчая рада ўключае 34 навукоўцаў з 13 краінаў.

Часопіс заняў сваю нішу ў развіцці навуковага накірунку — тэарэтычныя, эксперыментальныя, вылічальныя даследаванні і прыкладныя аспекты нелінейнай дынамікі складаных сістэмаў рознага паходжання, у тым ліку і сацыяльнага. Выданне ўзнікла і развілася дзякуючы аб'яднанню намаганняў беларускіх навукоўцаў, якія штогод прадстаўляюць свае распрацоўкі на канферэнцыях у БДУ і НАН Беларусі. Вялікую падтрымку аказвае Камітэт па навуцы і тэхналогіях пры Савеце міністраў.

Высокі ўзровень часопіса дазволіў заваяваць яму аўтарытэт у сусветнай навуковай супольнасці. Пра гэта сведчаць дадатныя водгукі і рэцэнзіі ў прэстыжных замежных часопісах (напрыклад, у "NATURE"). Сёлета ў красавіку часопіс атрымаў прызнанне Еўрапейскай фізічнай супольнасці.

Часопіс выходзіць на англійскай мове і мае інтэрнэт-версію (www.j-npcs.org). Апрача таго, ствараюцца і так званыя "люстэркі", якія спрашчаюць доступ да сайта часопіса ў Амэрыцы і Японіі.

*Па інфармацыі прэс-службы БДУ*

КОНКУРСЫ

## Навуковая работа. Якая лепшая?

Абвяшчаецца конкурс на лепшыя навуковыя работы студэнтаў (адна — у галіне сацыяльных і гуманітарных навук і адна — у галіне прыродазнаўчых і тэхнічных навук). Дакументы на конкурс прадастаўляюцца ў аддзел навукова-даследчай работы студэнтаў (вул. Бабруйская, 9, пакой 418, тэл. 209-54-27) з 14.00 да 16.00 штодзённа да 9.10.02 г. На конкурс прымаюцца працы асобных аўтараў, у некаторых выпадках дапускаюцца два аўтары. У конкурсе могуць узяць удзел выпускнікі 2002 года.

Інфармацыю пра конкурс (правілы афармлення, склад камісіі і г.д.) можна даведацца ў адказных па НДРС на факультэтах ці на серверы БДУ (усе агульныя папкі / Навукова-даследчая работа студэнтаў / Конкурс БДУ — 2002).

Наяўнасць публікацыяў для канкурсантаў абавязковая.

САКРЭТ ФІРМЫ

# БДУ мяняе абрысы горада

Тое, што на золку XX стагоддзя магло здзейсніцца толькі ва ўяўленні Уладзіміра Пічэты, сёння ўвасабляецца ў рэчаіснасць. Гэта толькі на першы погляд здаецца, што галоўныя архітэктурныя перамены Мінска адбываюцца пад зямлёй на плошчы Незалежнасці. На самой справе ўсё не зусім так. Цяжка перасягнуць наш універсітэт у прэтэнзіях на змену абрысаў горада. Як паведамілі "Беларускаму універсітэту" ў Дырэкцыі па будаўніцтве аб'ектаў БДУ, у бліжэйшай будучыні універсітэт абзавядзецца чатырма новымі збудаваннямі, а тры старыя будуць адрэканструяваныя.

Вядзецца рэканструкцыя ў доме № 14 па вул. Савецкай, пабудаваным на пачатку XX стагоддзя. Там размесціцца вучэбна-гасцінічны комплекс БДУ. Будынак будзе выконваць таксама функцыі Інстытута павышэння кваліфікацыі вышэйшага судовага корпуса.

Ёсць задумы і накont новых забудоваў: вучэбна-лабараторны комплекс факультэта міжнародных адносін і хімічны факультэт. Хімфак збіраюцца будаваць на вуліцы Курчатава, але з'явіцца ён няхутка: зараз вядуцца толькі праектныя работы. Затое факультэт міжнародных адносін на скрыжаванні вуліц Ленінградскай і Бабруйскай (перад "МакДональдзам") з'явіцца праз 2 гады. Нягледзячы на тое, што будаўніцтва распачалося не так даўно, у Дырэкцыі запэўніваюць, што гэтага часу хопіць на ўзвядзенне 14-павярховага хмарачоса.

Сярод усіх будаўнічых аб'ектаў БДУ адным з самых значных лічыцца будынак новай бібліятэкі — гэты праект падтрымліваецца ЮНЕСКА. Тры гады таму прадстаўнікі гэтай арганізацыі дапамагалі распрацоўваць праект, унеслі змены па архітэктурным дызайне і тэхнічным абсталяванні корпуса. Па словах дырэктара фундаментальнай бібліятэкі БДУ П.М. Лапо, усе 8 надземных і 2 падземныя паверхі будуць "да зубоў" мадэрнізаваныя. Тут будзе 10 чытальняў, дзе кожнае другое-трэцяе месца будзе абсталяванае камп'ютарам. Студэнтам, якія забылі назву патрэбнага падручніка і ведаюць яго толькі візуальна, больш не давядзецца выслухоўваць нараканні бібліятэкараў. Дзякуючы "канцэпцыі свабоднага доступу" кожны зможа выбіраць кнігі сам. У працэсе пошукаў можна знайсці яшчэ што-небудзь цікавае і карыснае.

Кнігі будуць дастаўляцца механічна — на вазочках. На жаль, да аўтаматызацыі працэсу пакуль што справа не дайшла: тэлеліфт (гарызантальная падача кніг па манарэйках) паставіць не ўдалося.

Пасля заканчэння ўсіх работ дзверы бібліятэкі будуць адчыненыя не толькі для супрацоўнікаў і студэнтаў БДУ, але і для ўсіх ахвотных.

*Юлія РАЎКУЦЬ, студэнтка II курса факультэта журналістыкі*

# Наваселле на Нарачы



У сям'і новых будынкаў БДУ — папаўненне. Аднак не спрабуйце знайсці "навічка" на шырокіх мінскіх вуліцах, бо знаходзіцца ён далёка па-за межамі нашай сталіцы. Калі дакладней, ля самага берага Нарачы.

Нарачанская біялагічная станцыя ўпершыню за 55-гадовую гісторыю змяніла месца прапіскі і сёлета са старых пабудоў пераехала ў новы дыхтоўны комплекс. Гэты будынак той-сёй з адпачывальнікаў прымае за палац "новага беларуса", а хтосьці — за храм авангарднай архітэктуры. Дырэктар установы доктар біялагічных навук Таццяна Васільеўна Жукава на такія заўвагі рэагуе ўсмешкай і з задавальненнем расказвае пра розныя моманты дзейнасці абноўленай біястанцыі. Па-першае, змяніўся статус біястанцыі — цяпер яна называецца Вучэбна-навуковы цэнтр "Нарачанская біялагічная станцыя". Па-другое, з'явіліся больш зручныя ўмовы для працы, прыёму студэнтаў, калег. Але, як і раней, асноўная задача цэнтра — навучанне студэнтаў БДУ: тут праходзяць практыку студэнты-першакурснікі біяфака. Потым, з III курса, яны прыязджаюць для збору матэрыялаў для курсавых і дыпломных праектаў, прыязджаюць таксама аспіранты і магістранты. Цэнтр можа працаваць круглы год, і даследаванні праводзяцца па самым шырокім профілі біялагічных праблем. І кожная з 10 кафедраў біяфака мае сваю лабараторыю.

Абсталявання, тым не менш, не дадалося: цэнтр спрабуе зарабіць на яго самастойна. У замежных калег выклікае цікавасць добра вывучаная група Нарачанскіх азёр. Даследаванні вядуцца ўжо больш за паўстагоддзя, і навуковая літаратура па іх складае звыш 500 манаграфій, артыкулаў, дакладаў. На будучы год на базе біястанцыі запланавана правесці міжнародную канферэнцыю, на якую запрошаны навукоўцы з розных куткоў свету. Між іншым, ужо зараз у новым будынку пабывалі навукоўцы з Канады, Швецыі, Ізраіля, ЗША.

Сёння біястанцыя супрацоўнічае з заснаваным 3 гады таму Нацыянальным паркам "Нарачанскі". Менавіта на даследаванні навукоўцаў БДУ і каштоўныя магчымасці біястанцыі абапіраецца кіраўніцтва Нацыянальнага парка ў сваёй дзейнасці. У перспектыве — далейшае развіццё даследаванняў на самым высокім узроўні і пашырэнне навучальнай базы для студэнтаў і аспірантаў.

*Настасся МАКАРАНКА, студэнтка II курса факультэта журналістыкі*
*Фота аўтара*

НА КАФЕДРЫ

# Дзяўчаты выбіраюць камуфляж

Вайна — справа не жаночая. Гэта ведае кожны. Аднак гісторыя ведае і імёны мноства жанчын-ваяўніц. У нашы дні таксама можна пабачыць жанчыну ў камуфляжы са зброяй у руках, і гаворка ідзе не толькі пра славутую ізраільскую армію.



З 1996 года на ваенную кафедру штогод набіраюць 7 дзяўчат-другакурсніц на спецыяльнасць "Маральнае і псіхалагічнае забеспячэнне дзейнасці войскаў". Для паступлення неабходна мець добрую паспяховасць, а таксама здаць іспыт па фізпадрыхтоўцы: бег на 100 і 2000 м (на "выдатна" — 15,7 секунд і 10,54 хвіліны адпаведна) і падцягванне лежачы (на "выдатна" — 60 разоў). Дзяўчат таксама чакае агульнаадукацыйны тэст. Паступленне адбываецца ў маі.

Спецыяльнасць "ваенная псіхалогія" дазваляе працягнуць навучанне ў Ваеннай акадэміі, школах МУС і КДБ, працаваць у пракуратуры, несці службу ў войску.

Заняткі па тактыцы, псіхалогіі, агнявой і страявой падрыхтоўцы даюць магчымасць не толькі зразумець тонкасці вайсковай справы, але і паверыць у сябе і свае сілы. Дзяўчаты навучаюцца разам з хлопцамі: ходзяць на лекцыі, практычныя заняткі. Улетку і ўвосень адбываюцца стрэльбы і зборы, на якіх студэнткі нярэдка складаюць сур'ёзную канкурэнцыю хлопцам.

Сярод былых выпускніц кафедры ёсць шмат вядомых імёнаў. Можна назваць чэмпіёнку Еўропы па лыжным спорце Алену Дарашэвіч і майстра спорту міжнароднага класа Марыю Вартынскую.

*Дзяніс ТРАФІМЫЧАЎ, студэнт факультэта журналістыкі*
*Фота аўтара*

СПОРТПЛЯЦОЎКА

# У зборную БДУ можа трапіць кожны

Кафедра фізічнага выхавання нашага універсітэта прапануе студэнтам заняткі ў секцыях па міні-футболе, валейболе, баскетболе, лыжным спорце, тэнісе, шахматах, плаванні і аэробіцы. Асаблівa варта адзначыць дзю-до і гіравы спорт — найбольш распаўсюджаныя сярод моладзі і з найбольш даўнімі традыцыямі: гіравым спортам займаўся яшчэ першы рэктар У.І.Пічэта. Запатрабаванымі апынуліся і навамодныя паўэрліфтынг з пэйнтболам, якія ўжо маюць сваіх герояў (В.Г. Булат, майстар спорту міжнароднага класа па паўэрліфтынгу, прызёр універсітэта).

Запісацца на секцыю можа кожны. Для гэтага трэба звярнуцца да выкладчыка фізвыхавання альбо да адказнага за культурна-спартыўныя мерапрыемствы. Заняткі ў секцыях адначасова з'яўляюцца і першым этапам спартакіяды, якая штогод праходзіць сярод студэнтаў I-IV курсаў. Другі этап — фінальныя зімовыя спаборніцтвы, у якіх прымаюць удзел да 3000 чалавек. Пераможца становіцца першым кандыдатам у зборную БДУ. Прабіцца ў яе можна, прайшоўшы кантрольныя спаборніцтвы, за якімі сочаць суддзі-спартсмены з БДУ і іншых ВНУ.

*Дзяніс ТРАФІМЫЧАЎ, студэнт II курса факультэта журналістыкі*

З ГІСТОРЫІ БДУ

*Студэнцтва універсітэта было розным ва ўсе часы: былі і добрыя людзі, і дрэнныя. І, відома, наіўныя былі і будуць існаваць заўжды.*

## Наіўная...

У сярэдзіне 1920-х гадоў ва універсітэце навучаліся розныя людзі. Розныя не толькі, як тады казалі, "па класавым паходжанні", але і па ўзроўні агульнага развіцця...

На медыцынскім факультэце ішлі іспыты. Старшынявалў у камісіі прафесар кафедры акушэрства і гінекалогіі М.Л. Выдрын. Як звычайна, адказы былі рознымі, як і ўзровень падрыхтоўкі студэнтаў.

Адказ адной студэнткі камісію напачатку ўзрадаваў. Дзяўчына вельмі старанна і падрабязна адказвала на пытанні, дакладна патлумачыла спалучэнне палавых клетак і драбленне яйка, распавяла пра плод і г.д. Здаецца, было відавочна: веды добрыя, адказы правільныя — "выдатна".

Аднак нечакана студэнтка заявіла экзаменатарам: "Аднаго я не разумею: як жа сперматазоід трапляе ў цела жанчыны?" Кажуць, ад гэтай ашаламляльнай наіўнасці камісія цалкам разгубілася, а ў старшыні ледзь не адняло мову.

Цікава, што ў тыя ж гады на старонках часопіса "Шлях студэнцтва" ўздымалася пытанне арганізацыі пры БДУ яслаў для студэнцкіх дзетак паводле прыкладу маскоўскіх ВНУ.

## Вывучыла атлас

Гэтая гісторыя здарылася сёлета з выпускніцай універсітэта Тацянай Г. Не сказаць, каб гэта была нейкая надзвычайная ці неверагодная гісторыя, але ўсё ж...

Спадарыня набыла атлас "Мінск сегодня". Пагартала — вырашыла знайсці сваю вуліцу і дом. Знайшла і раптам ускліснула:
— Хлусня! Аніякага кружочка побач з нашым домам няма!..
Працяглая паўза.
— Дык гэта стадыён!
Як кажуць, без каментарыяў.

*А.Г. ЗЕЛЬСКІ, загадчык музея гісторыі БДУ, кандыдат гістарычных навук*

АБ'ЯВЫ

**Інстытут ядзерных праблем Беларускага дзяржаўнага універсітэта**
аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад:

ЛАБАРАТОРЫЯ ТЭАРЭТЫЧНАЙ ФІЗІКІ
старшы навуковы супрацоўнік — 1 чалавек.
Тэрмін конкурсу — 1 месяц з дня апублікавання аб'явы.
*Адрас: 220050, г. Мінск, вул. Бабруйская, 11, аддзел кадраў, пакой 315, тэл. 226-42-31.*

УДАКЛАДНЕННЕ

У мінулым нумары "Беларускага універсітэта" за 19 верасня 2002 года ў матэрыяле Мікалая Градзюшкі "Студэнт, рыхтуйся раскашэліцца" была пададзена інфармацыя пра кошт пражывання студэнтаў у інтэрнатах БДУ.

Даводзім да ведама чытачоў, што для замежных студэнтаў месца ў інтэрнаце будзе каштаваць 52-64 долары за семестр, а не за месяц, як было указана ў гэтым матэрыяле. Рэдакцыя прыносіць прабачэнні.

ЗАХАПЛЕННІ

# Рамантыка даспехаў

"Ордэн Паўночнага храма", "Зубр", "Вітаўт" — усім вядомыя гэтыя рыцарскія клубы, якія аб'ядналі вакол сябе аматараў даўніны. Бляск латаў і зброі цешыць вока цікаўнага гледача, аднак такі глядач рэдка задумваецца пра цяжкасці, звязаныя з іх стварэннем.

"Кожны новаствораны элемент даспехаў для нас — свята пасля доўгіх працоўных будняў", — распавядае комтур (старшы афіцэр) клуба "Ордэн Паўночнага храма" Алег Ярашэнка.

Алега, нядаўняга выпускніка БДУ, я ведаю даўно. Некалі ён быў вельмі замкнёным у сабе, вельмі сарамяжлівым чалавекам. Але паступова ягоныя комплексы зніклі — нібыта нейкім чароўным чынам. Адначасова з гэтым у доме Алега сталі з'яўляцца цікавыя рэчы: кінжалы і булавы, плашчы і шлемы. Няцяжка было здагадацца, што адбываецца з маім сябрам.



"У рыцарскі клуб мяне прывяла цікаўнасць. Атмасфера нечага таямнічага і незвычайнага захапіла мяне, і я вырашыў застацца. Бяруць туды ўсіх, але гэта ўяўная простасць", — прызнаўся Алег.

Першы год ён вучыўся рабіць даспехі, чытаў літаратуру пра тактыку і гісторыю рыцарскіх войскаў, удзельнічаў у паядынках-трэніроўках. Але насамрэч Алег здаваў яшчэ адзін іспыт. Размаўляючы з навічкамі, раячыся з ветэранамі клуба, ён пераадольваў сваю прыроджаную скаванасць. "Праз год пасля прыходу ў клуб (менавіта такі выпрабавальны тэрмін) мяне дапусцілі да вырабу ўласных даспехаў, — прыгадвае Алег. — Мне выдалі спецыяльную літаратуру, замацавалі за мной інструктара. З таго часу я перайшоў у ранг збраяносца".



Гэта было самае цяжкое, бо для вырабу поўнага даспеху патрэбны час і праца. Як прызнаўся Алег, шмат разоў ён хацеў кінуць усё, але таварышы дапамагалі пераадольваць нягоды.

Бугурт (групавы бой) вырашае лёс збраяносца: ён альбо становіцца рыцарам, альбо не. Кандыдат на званне рыцара павінен выйсці на бой ва ўласных латах. Меч Алега тройчы дакрануўся да варожага панцыра — гэта была перамога.

Дзень пасвячэння ў рыцары (урачыстая цырымонія, на якой прысутнічаюць усе сябры клуба) стаў паваротным у яго жыцці: Алег атрымаў права на павагу з боку заслужаных сяброў клуба. Падарожжы па гарадах Еўропы, удзел у турнірах у Заслаўі, Навагрудку, Празе і Грунвальдзе канчаткова пераканалі Алега ў яго сілах.

Праз 5 гадоў аднаклубнікі прысвоілі яму тытул комтура, які дае права не толькі на ўласны герб (белая змяя на чорным полі), але і на красамоўны дэвіз — "Заўжды наперад!".

*Дзяніс ТРАФІМЫЧАЎ,*
*студэнт II курса факультэта журналістыкі*
*Фота аўтара*

ПАДАРОЖЖЫ

# ПАРЫЖ: CONTRAPUNCT

Адважны той чалавек, які асмеліцца дадаць што-небудзь сёння пра гэты горад, хоць, несумненна, Парыж у кожнага свой. Хіба што залева?.. Дождж ліў і ліў, калі мы, здарожаныя, ледзь цягнуліся, падымаючыся па бясконцай, здавалася, лесвіцы на самую высокую ў Парыжы гару, дзе размясцілася базіліка Святога Сэрца — Сакрэ Кёр, каб трапіць на Монмартр, пабачыць мастакоў і пераканацца, што малююць яны (каларытна!) пейзажы ў стылі фламандскага жывапісу і партрэты "з натуры" якой-небудзь кучарававалосай негрыцянкі. Дождж, як на заказ, спыніўся, даўшы нам мажлівасць сфатаграфавацца. Тут жа "Мулен Руж" — кабарэ "Чырвоны млын" з ягоным танцавальным шоу...

Патрэбны іншы лад і склад, каб на ўзвышаных танах усхваліць і Луўр, і Эйфелеву вежу, і Елісейскія палі, і Палац правасуддзя, і Кансьержэры, і статую Свабоды, копія якой была падорана Амерыцы. Гэтая статуя так нечакана "выплывае" ў час прагулкі на кацеры па Сене, што чалавек, на хвіліну заплюшчыўшы вочы, раптоўна раскрыўшы іх, пытаецца: "Дзе мы?"

Своеасаблівымі кантрапунктамі Парыжа здаюцца ўсе гэтыя выключныя збудаванні, палацы, масты, вежы, саборы, аркі, цэнтры, тэатры, сады, вуліцы, старажытныя руіны. Горад, дзе захаваліся яшчэ рымскія лазні, сярэднявечныя вулачкі, дзе сімвал партрэтнага жывапісу "Джаконда" Леанарда да Вінчы — шэдэўр, да якога і ў спякотны дзень ў Луўр не дабіцца: індусы, кітайцы, японцы фатаграфуюць, стаяць сцяной. Паблукаеш па залах, добра ўваб'еш ногі, пакуль знойдзеш багіню прыгажосці Венеру, якая выступае са свайго адзення, — скульптуру, знойдзеную на востраве Мілас. Ідэал пачуццёвасці і прыгажосці. Міжволі згадваецца аднайменны верш М.Танка:

*Бачу: ідзе яна лёгкай хадою.*
*Рук няма.*
*Пэўна, маланка скрышыла,*
*Каб перад небам і перад зямлёю*
*Грудзі свае імі не засланіла.*

Вуліцу Рывалі мы прайшлі некалькі разоў, мінаючы ўваход у "чэрава Парыжа" — сотні і тысячы гандлёвых радоў пад зямлёю амаль што ў цэнтры горада. Сад Цюільры, дзе даўней здабывалі гліну для чарапіцы. Мост Аляксандра III з двухгаловым арлом на арцы з аднаго боку і гербам Парыжа — з другога. Трыумфальная арка, дзе заканчваюцца ці пачынаюцца Елісейскія палі, асабліва ўражвальныя ў вячэрні і начны час. Яны добра глядзяцца ў агнях на фоне застылай Сены з вежы Густава Эйфеля. Вежы, пабудаванай у 1900 годзе да сусветнай выстаўкі ў Парыжы. Тут, ля паднożжа Эйфелевай вежы, вечарамі тоўпіцца моўны Вавілон...

І асобна — музей Агюста Радэна, які на запытанне, як ён "высякае" свае фігуры, адказваў: "Бяру кавалак мармуру і адсякаю ўсё лішняе". Цуд для мяне і сёння — у мармуры аблічча дзяўчыны з поглядам з-за белай-белай павалокі. Як дабіцца такой выразнасці ў мармуры? "Пацалунак", "Мысліцель", "Вечная вясна", "Вароты ў пекла", "Крык", "Сабор", "Іаан Хрысціцель".

Аднак ёсць адна дата ў жыцці Парыжа і Францыі, якая не магла пакінуць абыякавымі нас з маёй блізкай спадарожніцай: 14 ліпеня — Дзень незалежнасці Францыі і дзень нараджэння (няхай даруюць за нясціпласць) маёй жонкі. Бастылія пала! Бастылія жыве. Камянямі турмы выбрукавана плошча Бастыліі, ды яшчэ тыя камяні былі разасланы ва ўсе правінцыі Францыі, каб выбрукаваць імі дарогу да свабоды і праўды.

І здрадлівая сляза замілавання "падхлынула" каля Сабора Парыжскай Божай маці. Там, перад парталамі Прасвятой Дзевы, Страшнага Суда і св. Ганны, перад ярусамі, дзе жывуць гаргуллі (напоўжанчыны—напоўсабакі), дзе існуюць хімеры, дэманы, ведзьмакі, фантастычныя дзікуны, дзе пакутавала і радавалася Эсмеральда і ўзлятаў у паднябессе Квазімода ў рамане В. Гюго "Сабор Парыжскай Божай маці".

Пад праліўной залевай я хадзіў сам-насам па Парыжы. Пабываў каля доміка В. Гюго, доўга абыходзіў паўкруглы будынак Парыжскай "Гранд-Апера", на сцэне якой адначасова могуць выступаць да 450 акцёраў, сама зала змяшчае 2 тысячы гледачоў, а люстра важыць 8 тон.

Вось яна, найвялікшая сцэна тэатра жыцця!

І Парыж — велізарны тэатр жыцця, рэалістычны, казачны, старадаўні і сучасны вечна. У горадзе жыве 2 млн. 100 тысяч чалавек (амаль як у Мінску!), але затое тут бывае яшчэ 6 млн. турыстаў. Гэта духоўная сталіца свету.

## Дыснэйленд Парыжа

Яркім сонечным ранкам наш турыстычны аўтобус заехаў на тэрыторыю горада-казкі, горада-прывіда, горада дзяцей — Марне-ла-Вале. Тут, у 32 км на ўсход ад Парыжа, размяшчаецца Дыснэйленд, які налічвае 5 цудоўных гарадкоў-правінцый, 5 абласцей.

"Мой горад" — амерыканскі гарадок пачатку XX стагоддзя.

"Frantierland" — пасёлак часоў "залатой ліхаманкі" на Захадзе ЗША і на Алясцы.

Яшчэ адзін куточак, дзе сэрца трапеча, — выключная экзатычная краіна "Adrenfulland". Гэта неверагодная сумесь, дзе перапляліся Афрыка і Карыбскія астравы, гэта джунглі, дзе на кожным кроку сустракаюцца прыгоды і таямніцы.

"Fantastyland" — краіна казак, фантазій, ілюзорны свет дзіцячых выдумак.

"Discoveryland" — будучыня чалавецтва паводле Жуля Верна, дзе цесна перапляліся мара і рэальнасць.

У Дыснэйлендзе людзей больш, чым у Луўры: не прайсці і не праштурхнуцца. І кожны знаходзіць сабе занятак па душы, кожны можа свабодна вандраваць па гарадках, не баючыся згубіцца. Калі хочаш патрапіць на які-небудзь атракцыён, дык падыходзь да кантролю — прабі на кампосцеры час наведвання і ідзі сабе — гуляй на здароўе, не заблудзіся толькі. Варта ў адпаведны час падыйсці і прайсці на гульні ў тэрмін, вызначаны табе. Зручна! За гэты час можна наведаць магазіны. Можна пасядзець у кавярні, заняцца іншымі гульнямі, на якія няма такога попыту. Так здарылася, што мы першы раз трапілі на самы страшны атракцыён, які павінен быць самым апошнім па часе наведвання — на Space Mountain — магутную гармату, якая "выстрэльвае" чалавека ў віртуальную зорную прастору — і ўверх, і ўніз, і ўглыб, і ўгору. Такі атракцыён не кожнаму даецца лёгка: крык, піск, лямант суправаджаюць наведніка на працягу ўсяго шляху да зорак. Ідзе вялікае выпрабаванне духу і цела. І калі ўбачыш прасветлены твар сонца — адхлынае чырвань ад твару, сэрца ледзь не выскоквае...

А яшчэ ёсць спуск на рускіх горках Індыяны Джонс сярод руінаў зусім згубленага некалі вядомага горада. А вось маленькі траскучы, скрыпучы, абдзёрты і ледзь злеплены цягнічок шпурляе наведнікаў уніз-уверх, заварочвае на крутых паваротах. То знікаючы ў віядуку, то выскокваючы на паверхню з віскам і крыкам, ён з грукатам і вохканнем вязе сваіх пасажыраў паўз пакінутыя радовішчы золата Дзікага Захаду. Вось цягнік знікае ў змрочным цагельна-попельным з жаўцізной каньёне, бяжыць між гор і ў расколінах вастраверхіх скалаў. Тут вы патрапіце ў кіно, дзе па вас будуць поўзаць віртуальныя змяюкі, павукі, мышы.

Затое ў свеце казак можна праехацца ў залатой карэце, сустрэцца з дыснэеўскімі героямі. Вялікае прадстаўленне ідзе на вялікай сцэне і зале.



А самае неверагоднае — гэта свет прывідаў, чараўніцтва, варажбы, прымхаў і забабонаў, калі над галавой зіхацяць маланкі, грымяць грымоты, а чалавек раптам апынаецца ў падзямеллі. Тут, едучы ў мяккім і вяртлявым ва ўсе бакі крэсле-канапе, можна сустрэцца з гаваркімі шкілетамі, з такімі ж галовамі, з лазернымі жаніхом і нявестай, якія растаюць у мроіве вашых мараў, а бывае, раптам перад вамі апынуцца вампіры, цмокі, вядзьмаркі, чэрці. І ўся гэтая камарылля хапае вас за рукі, за ногі, за калені, за куртку, нагінаецца над вамі, рагоча ўслед, задзірае і палохае.

Пакуль праедзеш шлях па сутарэннях — дух захоплівае не аднойчы, душа ў пятках не раз і не два апынецца, а ўваччу — каледайскоп фігурак, прывідаў, страшыдлаў, якія змяняюць адно аднаго. І страшэнны рогат услед...

Краіна казак і дзятвы не для слабакоў. Захочаш — трапіш на марскі карабель і пагуляеш у піратаў, у разбойнікаў. Адно слова — пагуляеш, калі застанешся цэлы ў бойцы з марскімі піратамі.

Узнагарода для ўсіх: у 15.00 гадзін на цэнтральную алею выходзяць персанажы ўсіх пяці краінаў дзіцячай казкі. Відовішча — адно за другое прыгажэйшае. На кветачкі ў паднябессі — Дзюймовачка, ля Дракона — добры маладзец з шабелькай, у турэцкага султана — прыгажуня-паланянка ў аддаленні ад людскога вока. А ёсць яшчэ маракі, стракозы, матылькі, ваўкі, козы, авечкі, бараны, быкі, каровы, ліхія вершнікі, рыцары ў латах — усё гэтае воінства праходзіць перад гасцямі Дыснэйленда.

Ідзе парад-але літаратурных персанажаў дзіцячых казак. Шчоўкаюць фотаапараты. Да пераапранутых актораў — мішак, лісічак, ваўкоў — цягнуцца дзіцячыя ручкі, тыя з імі забаўляюцца, гуляюць, чапаюць адзін аднаго. Шмат сонца і ўсмешак. Зіхацяць чырванашчокія дзіцячыя тварыкі.

Можа, гэта і ёсць зямны-незямны "рай"?..

Пакуль што няхай сабе толькі для дзяцей...

*Уладзімір НАВУМОВІЧ,*
*дацэнт,*
*пісьменнік*

КНІЖНАЯ ПАЛІЦА

# Гістарычная навука ў БДУ на ўздыме

Нядаўна наведаў упраўленне рэдакцыйна-выдавецкай работы універсітэта. Звярнуў увагу на стос кніг, ад якіх яшчэ зыходзіў лёгкі пах друкарскай фарбы. Задавальненне зразумелае: у гэтым годзе ўпраўленне дало дарогу ў кніжнае жыццё значнай колькасці падручнікаў, вучэбных дапаможнікаў, "метадычак". Толькі ў галіне гісторыка-грамадазнаўчых навук іх аказалася больш за сорак. Гэта ўнушальны выніковы паказчык творчых намаганняў аўтараў, рэдактараў, тэхнічнага персаналу па стварэнні кніг, якая, нягледзячы на канкурэнцыю з боку мноства сучасных цудаў перадачы інфармацыі, па-ранейшаму вызначае ступень цывілізаванасці грамадства.

Пераважная большасць новых выданняў вызначаецца высокай якасцю афармлення, прывабнасцю, дбайным захаваннем кніжнага крытэрыя: спалучаць эстэтычны выгляд з глыбокім сэнсам і даступным выкладам зместу. Значная іх частка напісана на беларускай мове.

А зараз пагартаем старонкі навінак па гістарычнай тэматыцы. Пачнем з найбольш "даўніх", беручы за дзень нараджэння кнігі дату падпісання да друку.

Кожны гісторык палічыў бы за гонар узяцца за такую незвычайна складаную тэму, як інтэрпрэтацыя на Захадзе савецкай гісторыі 1930-х гг. Праўда, досыць нядаўна на нашых вачах у Савецкім Саюзе з'яўляліся шматлікія брашуркі і нават тоўстыя фаліянты, якія давалі "ідэалагічны адпор фальсіфікатарам савецкай гісторыі і зняважальнікам народа-будаўніка камунізму". Ісціны ў згаданых "даследаваннях" было на напарстак, а сутнасці ацэнак заходніх саветолагаў зразумець у іх увогуле было немагчыма. І вось з'явілася праца дацэнта гістфака В.І. Мянькоўскага "Власть и советское общество в 1930-е годы: англо-американская историография, проблемы". Яе з поўным правам можна назваць адной з першых на постсацыялістычнай прасторы і, як падаецца, адной з найбольш паспяховых спроб усебаковага і аб'ектыўнага вывучэння заходняй навукі пра СССР. Фундаментальны характар ёй надае разгляд усіх нацыянальных школ, якія склалі тое, што ў сукупнасці можна ўмоўна назваць англамоўнай гістарыяграфіяй, — англійскай, амерыканскай, канадскай і аўстралійскай.

Дзве кнігі прысвячаюцца ролі духоўнасці ў гістарычным працэсе. Адна з іх, "История культуры России новейшего времени (1917—2000 гг.)", падрыхтавана як дапаможнік для студэнтаў БДУ ў аўтарскай рэдакцыі дацэнтам гістфака В.В. Брыгадзінай. Багаты даследчыцкі і выкладчыцкі вопыт аўтара дазволіў прайсці паміж "сцылай і харыбдай" — не адмаўляючы бясспрэчных дасягненняў савецкай улады ў сферы культуры (ліквідацыю масавай непісьменнасці, стварэнне сістэмы высакаякаснай адукацыі і разгалінаванай сеткі ўстановаў культуры, паспяховага развіцця асобных навуковых напрамкаў), паказаць, што партыйна-дзяржаўная ўлада ў СССР за гады свайго існавання парушыла пераемнасць у развіцці расійскай культуры, паставіла пад пагрозу захаванне самабытных традыцый народа. Класавы змест і марксісцка-ленінская накіраванасць культуры дэфармавалі людзей, выхоўвалі ў характары і паводзінах чалавека комплекс заганаў, які атрымаў трапную назву "саўковасць".

Другая кніга — дасканала прапрацаваная на ўсіх дэталях манаграфія дацэнта гістфака В.В. Яноўскай "Хрысціянская царква ў Беларусі ў 1863—1914 гг.", якая распавядае пра змены ў стане праваслаўя, каталіцтва, стараверства, пратэстанцтва. Знаёмства са зместам уражвае, па-першае, багаццем дакументальных крыніц, на якіх грунтуецца ўсё даследаванне, і, па-другое, навізной самой тэмы, якую ўлады, ваяўнічыя атэісты, у мінулым пастаянна і мэтанакіравана ігнаравалі. Аўтар жа пераканаўча даказвае, што на нацыянальную адметнасць і гістарычны лёс беларусаў, на стан грамадства хрысціянскія канфесіі накладвалі непаўторны адбітак, а некаторыя з іх падзялялі драматычны лёс нацыі.

У параўнанні з канфесіямі ў Беларусі тэме шляхты раней "шанцавала" больш: пра шляхту, шляхецтва пісалі, хоць і ў стылі праклёну на адрас эксплуататараў і пагарды да іх традыцый. Цалкам іншы даследчыцкі падыход знайшоў загадчык кафедры старажытнай і сярэдневечнай гісторыі Беларусі гістфака П.А. Лойка ў сваёй манаграфіі "Шляхта беларускіх земляў у грамадска-палітычным жыцці Рэчы Паспалітай другой паловы XVI — першай трэці XVII ст." Грунтоўна аналізуючы архіўныя крыніцы, ён цікава і даступна распавядае пра палітычныя інтарэсы і сацыяльную актыўнасць шляхты, яе грамадска-палітычную свядомасць, праз якую прабіваліся беларускія нацыянальныя інтарэсы ва ўмовах процістаяння з суседзямі: дыпламатычнага — з заходнім і інтэрвенцыйнага — з усходнім.

Аматары палітычнай гісторыі абавязкова звернуць увагу на амаль 300-старонкавы зборнік матэрыялаў "История политических партий". Аўтары-складальнікі У.К. Коршук, У.Ф. Ладысеў, І.Ф. Раманоўскі і інш. прапанавалі багатую падборку дакументаў палітычных партый і рухаў, якія былі заснаваныя і дзейнічалі на тэрыторыі Беларусі або з'яўляліся часткай агульнарасійскіх (савецкіх) палітычных арганізацый. Выданне шматфункцыянальнае па сваім прызначэнні: яно ўзбагала ў сябе не толькі хрэстаматыйныя матэрыялы, але і аналітычныя даведкі-эсэ пра дзейнасць Канстытуцыйна-дэмакратычнай партыі (кадэтаў), партыі "Саюз 17 кастрычніка", Расійскай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі (РСДРП), партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў (эсэраў), Бунда, Беларускай сацыялістычнай грамады, Кампартыі (бальшавікоў) Беларусі (КП(б)Б), Кампартыі Заходняй Беларусі (КПЗБ).

Больш сціпла ў параўнанні з папярэднімі кнігамі аформлены курс лекцый "История Украины (IX — первая половина XVII в.)". Але справа не ў аздабленні вокладкі, а ў змесце выдання, аўтар якога — вопытны педагог, дацэнт гістфака С.В. Пазняк. Яго твор надзвычай карысны для ўсіх, хто цікавіцца гісторыяй, найперш — для студэнтаў. Гэта погляд беларускага гісторыка на мінуўшчыну нашай паўднёвай суседкі. Мінуўшчыну, пра якую толькі хуткагаворкай згадвалася ва ўсіх савецкіх выданнях. Дарэчы, падзеі і ў іншых савецкіх рэспубліках тады акрэсліваліся толькі пункцірам, каб імі не зацьміць вызначальнасць гісторыі вялікарускай.

Цікавасць чытача выкліча манаграфія "Политическое развитие Польши в 70—80-е гг. XX в.". Яе напісаў Л.В.Лойка — вядомы беларускі паланіст, які ў даследаваннях гады якраз знаходзіўся ў Польшчы на дыпламатычнай службе, а зараз загадвае кафедрай дыпламатычнай і консульскай службы факультэта міжнародных адносін. Зразумела, уласныя назіранні за працэсам карозіі сацыялізму і выспяванне новага ладу ў гэтай дзяржаве істотна павышаюць даказнасць навуковай фабулы, захопліваюць чытача з першых старонак. Перад ім яскрава паўстаюць адносна нядаўнія падзеі: узнікненне і апазіцыйная дзейнасць зараз ужо легендарнай "Салідарнасці", пошукі выйсця з крутога палітычнага і эканамічнага крызісу, якімі ўвесь час была занята Польская аб'яднаная рабочая партыя — "кіруючая і накіроўваючая" сіла грамадства, крывавыя сутычкі супрацьлеглых палітычных сіл, роля знешніх фактараў (СССР і Захаду) у спробах вырашэння грамадзянскага канфлікту.

Трэба спадзявацца, што нават гэты невялікі пералік навадрукаў пацвярджае ўжо заўважаную агульную тэндэнцыю: гістарычная навука Беларусі ўступіла ў новы этап свайго развіцця, які прыйшоў на змену радыкальным захапленням і ацэнкам першай паловы 1990-х гг. Ён характарызуецца грунтоўнасцю, глыбокай аналітычнасцю, навуковай верагоднасцю. Цікава, што, як і манаграфіям, большасці падручнікаў і дапаможнікаў па гісторыі таксама ўласцівая навуковая і даследчыцкая навізна. Амаль аднолькавая адбываюцца два працэсы: навукова-тэарэтычная распрацоўка праблем гістарычнай навукі і іх адаптацыя для адукацыйных патрэб. Радуе тое, што гістарыкі БДУ рупліва і плённа працуюць на ніве стварэння сучаснай беларускай гістарыяграфіі.

*Мечыслаў ЧАСНОЎСКІ,*
*прафесар кафедры міжнародных адносін*

**АД РЭДАКЦЫІ:**

Выказваючы ўдзячнасць аўтару за ўдзел у нашай рубрыцы "Кніжная паліца", трэба дадаць, што ён сам актыўна папаўняе гэтую паліцу. Газета публікавала ўжо ў снежаньскім нумары за 2000 г. гутарку з М.Э. Часноўскім пра яго манаграфію "Сістэмныя пераўтварэнні ў Рэспубліцы Польшча (1989—1999)". Сёлета улетку ўбачыў свет яго вучэбны дапаможнік "Краіны Сярэдняй Еўропы ў 1990-я гг.", дзе падагулены вопыт пераходу еўрапейскіх краін былога сацыялістычнага лагера ад аўтарытарнай палітычнай сістэмы і камандна-адміністрацыйных метадаў кіравання да палітычнай дэмакратыі, рынкавай эканомікі і стварэння грамадзянскай супольнасці. А літаральна днямі падпісаны да друку вучэбна-метадычны дапаможнік М.Э.Часноўскага "История внешней политики Беларуси", адрасаваны замежным студэнтам ВНУ.

# Новыя кнігі

*З пачатку года ва Упраўленне рэдакцыйна-выдавецкай работы паступіла 178 рукапісаў, унесеных у Тэматычны план выдання вучэбнай, вучэбна-метадычнай, даведачнай і навуковай літаратуры.*

*Звяртаем увагу аўтараў на неабходнасць прадставіць запланаваныя рукапісы да 25 кастрычніка бягучага года.*

*Л.А. Мурина, Т.В. Игнатович, И.В. Таяновская.* **Практикум по теории риторики.** Навучальна-метадычны дапаможнік накіраваны на паэтапнае фарміраванне ўменняў па практычным прымяненні найважнейшых палажэнняў тэорыі рыторыкі.



*А.В. Гарник, Г.Р. Наливайко, Г.И. Шевченко.* **Латинский язык.** Навучальны дапаможнік, рэкамендаваны Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь, прызначаецца для студэнтаў юрыдычных факультэтаў і каледжаў. У кнізе падаецца гісторыя лацінскай мовы, рымскай дзяржаўнасці і права, сістэматычны выкладаецца граматычны матэрыял, практыкаванні для замацавання граматычнага матэрыялу, а таксама хрэстаматыйныя і арыгінальныя тэксты лацінскіх аўтараў на юрыдычныя тэмы.



*Т.В. Караичева, Г.Б. Филимонова, С.А. Дубинко, А.П. Девкин, С.Е. Маковская, Г.В. Позняк.* **Практикум по переводу (английский — русский).** Навучальна-метадычны дапаможнік для студэнтаў гуманітарных спецыяльнасцяў накіраваны на працу над грамадска-палітычнымі, эканамічнымі і агульнагуманітарнымі тэкстамі на семінарскіх і практычных занятках.

*А.Л. Гурский, Е.В.Луценко, И.С. Манак.* **Физика полупроводниковых источников излучения.** Практыкум з грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь падае апісанні лабараторных работ і заданні па вымярэнні параметраў некагерэнтнага і лазернага выпраменьвання паўправадніковых крыніц сіне-зялёнага дыяпазону.

*А.П. Клищенко.* **Оптика. Курс лекций.** У кнізе падаюцца матэрыялы лекцый па оптыцы, якія цалкам адпавядаюць праграме курса агульнай фізікі для універсітэта.



*М.Э. Часноўскі.* **Краіны Сярэдняй Еўропы ў 1990-я гг. У дзвюх частках. Частка 1. Сістэмныя пераўтварэнні.**



Навучальны дапаможнік з грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь раскрывае працэсы сістэмнай трансфармацыі, якая ажыццяўляецца з пачатку 90-х гадоў мінулага стагоддзя ў сярэдняеўрапейскіх краінах былой сацыялістычнай сістэмы.

*Л.В. Хведченя.* **Содержание иноязычного образования: история и современность (на примере классического университета).**



У манаграфіі падаюцца пытанні эвалюцыі зместу навучання замежным мовам з пункту погляду гістарычнай рэтраспектывы і перспектывы.

*Упраўленне рэдакцыйна-выдавецкай работы БДУ*

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты — БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

*3 кастрычніка 2002 года*
*Падпісана да друку 2.10.2002*
*Ум. друк. арк. 1*
*Зак. 1162. Тыраж 1000 экз.*

*Газета зарэгістравана Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 149 ад 28 чэрвеня 1996 года.*

*Распрацоўшчык лагатыпа і дызайну газеты У.У. Васюк*

*Газета надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ" 220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6*

Рэдактар Т.М. КАЗАК

*Адрас рэдакцыі: 220050, Мінск, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 7, паверх 4, пакой 411, тэлефон 209-53-45.*